# Добрая звычка


Аддзяленне кругласутачнага знаходжання адзінокіх састарэлых.

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Дарэчы, адна з версій назвы Бабінавічаў — ад слова «баба» — ком гліны, падрыхтаваны ганчаром для работы над вырабам. Напэўна, было б лагічным стварыць у аграгарадку ганчарны турыстычна-адукацыйны цэнтр. Асабіста бачыў такі ў вёсцы ў латвійскай Латгаліі (на мяжы з Беларуссю). Там у будынку былой школы ганчар зрабіў майстэрню і прымае турыстаў, прадае свае вырабы... Пад рэалізацыю ідэі можна, дарэчы, атрымаць грант. Тым больш што ў Бабінавічах жыў дзед Марка Шагала. Пра апошняе мала хто ведае.

## 800 РУБЛЁЎ У МЕСЯЦ

Мясцовае лясніцтва таксама актыўна ўдзельнічае ў добраўпарадкаванні. Цэх дрэваапрацоўкі тут аснашчаны сучасным абсталяваннем, якое купілі за 60 тысяч еўра. Працуюць ў 2 змены па 12 гадзін (праз 2 дні) самыя спрытныя ў цэху «бруднымі» зарабляюць па 800 і больш рублёў — для глыбінкі гэта вельмі добры ўзровень аплаты працы.

Жывёлагадоўчы комплекс у вёсцы Асіпенкі спраўна папаўняе казну падаткамі, якія ў тым ліку накіроўваюцца і на добраўпарадкаванне. 470 кароў штодня даюць больш чым па 16 літраў малака. Зарплата ў даярак — да 500 рублёў. Ферма абсталявана сістэмай відэаназірання, добра механізаваная.

Удзельнікам пасяджэння паказалі і аддзяленне кругласутачнага знаходжання адзінокіх састарэлых, вакол якога таксама ідэальны парадак. Унутры будынка, які некалькі гадоў таму рэканструявалі, ёсць усё неабходнае, нават трэнажорная зала.

— У нас жывуць 26 дзядуль і бабуль. Многія актыўна займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторыі. Вядома, што сельскія жыхары прывыклі працаваць на зямлі, для іх у радасць нешта пасадзіць, даглядаць за кветкамі, садавінай і гароднінай, — гаворыць **загадчыца ўстановы Наталля ХАРКЕВІЧ.**

Убачылі народныя выбраннікі і месцы памяці герояў-вызваліцеляў. У прыватнасці, мемарыял «Ціхмянаўская вышыня», які знаходзіцца ў ідэальным стане. Адзін з яго аўтараў — вядомы віцебскі скульптар Азат Тарасян. Мясцовыя комплекс называюць «Курган славы». Гара атрымала назву ў гонар старшага лейтэнанта Ціхмянава, які за геразім быў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.


У школьным музеі ў Бабінавічах
(*справа* — старшыня Бабінавіцкага сельскага Савета Вольга МАРЖАЕДАВА).

## ДЗЕ ГАСПАДАР, ТАМ І ПАРАДАК

Пасля наведвання аб'ектаў адбылася шчырая размова ўдзельнікаў мерапрыемства з раённай уладай. **Старшыня райвыканкама Іван ЛАЎРЫНОВІЧ** падкрэсліў, што навядзенне парадку — не «акцыя для галачкі». Ад кожнага кіраўніка — сельсавета, арганізацыі, сельскагаспадарчага прадпрыемства патрабуецца, каб добраўпарадкаванне стала добрай звычкай. І на энтузіязме многае можна зрабіць. Напрыклад, у вёсцы Дабрамыслі крыніцу, якая раней больш нагадвала сметнік, ператварылі ў «звычайны цуд». Туды і з Расіі, з якой мяжуе Лёзненшчына, па ваду прыязджаюць. Дарэчы, сярод актывістаў, якія наводзілі прыгажосць, былі і ратавальнікі. **Начальнік раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Віталь ЧАЙКІН,** дэпутат райсавета, выступаючы на сесіі, сказаў, што працавалі яны з добрым настроем і дзеля патрэбы душы. У вольны час, у выхадныя бяруць рыдлёўкі ў рукі і — уперад!

— Насамрэч для навядзення парадку не заўсёды патрабуюцца грошы. Было б толькі жаданне — і многае можна зрабіць; каб дзеці нашы нам потым сказалі «дзякуй», — лічыць старшыня райвыканкама.

Ён заклікаў па-гаспадарску клапаціцца аб кожным метры зямлі. У прыватнасці, у свой час было шмат ахвотных браць зямлю для апрацоўкі. Цяпер сітуацыя змянілася. У старых сілы не тыя, а моладзь за вялікімі ўчасткамі ў чаргу не становіцца. Зямля перадаецца гаспадаркам. Але для іх дробныя надзелы, можна сказаць, «галаўны боль». Выкарыстоўваюцца не так эфектыўна, як хацелася б. Але ў любым выпадку зямля павінна працаваць на эканоміку.

Новыя вытворчасці, прагучала падчас пасяджэння, — гэта дадатковыя падаткі ў мясцовы бюджэт, як і працоўныя месцы, якія павінны апраўдваць патрабаванням часу. Зразумела, ёсць надзея на нядрэнныя заробкі і зноў жа падаткі з іх. А грошы будуць накіроўваць у тым ліку і на добраўпарадкаванне. Такім чынам, прыгажосць і эканоміка працуюць ў «звязцы».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

ФОРМА І ЗМЕСТ

# ПАДУМАЛІ І... СТВАРЫЛІ

## Асацыяцыя мясцовых Саветаў: дубліруючы орган улады ці новы крок на шляху самакіравання?

**Здаецца, недахопу ў дэпутатах у нас няма. Механізм мясцовых Саветаў працуе на ўсіх узроўнях — ад сельскіх да абласных. Але гродзенскія дэпутаты вырашылі стварыць новае фарміраванне — першую ў краіне абласную асацыяцыю мясцовых Саветаў. За два гады тут упэўніліся — новая арганізацыя сваімі захадамі садзейнічае аўтарытэту дэпутацкага корпуса.**



### Крок да самастойнасці

Выхад на міжнародны ўзровень — такую мэту ставяць перад сабой члены асацыяцыі. Іх зараз больш за 400 — амаль трэцяя частка ўсяго дэпутацкага корпуса Гродзеншчыны. У склад асацыяцыі ўваходзяць прадстаўнікі абласнога, гарадскога, 10 раённых і 38 сельскіх Саветаў. Любы член асацыяцыі можа прадстаўляць інтарэсы Саветаў усіх узроўняў на розных канферэнцыях і форумах, у тым ліку міжнародных. Праз асацыяцыю лягчэй знайсці кантакт з прадстаўніцтвам замежных краін, а таксама прыняць удзел у трансгранічных праграмах.

— Усе міжнародныя органы самакіравання лепш ідуць на кантакт менавіта з асацыяцыямі, бо тут прадстаўлены ўвесь дэпутацкі корпус, — падкрэслівае **старшыня праўлення Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль НІКІЦІН.** — Калі нейкі праект распачаўся ў сельскім Савеце, яго будзе «цягнуць» уся арганізацыя. Гэта значыць, што ёсць больш шанцаў на поспех.

Пакуль новы кірунак асвойваецца. Але ёсць добрыя перспектывы. Днямі гродзенская асацыяцыя зарэгістравана ў фондзе імя Л. Сапегі, які садзейнічае развіццю мясцовага самакіравання. У Гродне адбудзецца сустрэча з кіраўніком фонду па абмеркаванні сумесных праектаў. Анатоль Нікіцін настроены аптымістычна. На яго думку, асацыяцыя ўжо восенню можа стаць партнёрам міжнародных праектаў, якія накіраваны на ўзнаўленне гістарычных помнікаў, храмаў, сядзіб.

### Эскізы падтрымалі

Гродзенцы супрацоўнічаюць з органамі самакіравання Расіі, Украіны, Арменіі. Вынікам гэтага сталі канкрэтныя праекты па ўзнаўленні помнікаў расійскіх генералаў, удзельнікаў вайны 1812 года, якія пахаваны на тэрыторыі вобласці. Так, у Гродне памёр ад ран малады генерал Ланской, якому было толькі 32 гады. Адметны помнік патрабуе рэканструкцыі. Члены асацыяцыі правялі работу па яго абследаванні і заказалі новы праект па аднаўленні агароджы, абліцоўкі, мемарыяльнай дошкі.

Другі праект таксама датычыцца героя вайны 1812 года, генерала Гальперына, які пахаваны ў Зэльве. Эскізы ўзноўленых помнікаў адпраўлены расійскаму боку.

Партнёрам гродзенскай асацыяцыі мясцовых Саветаў стаў маскоўскі музей-панарама «Барадзінская бітва». Менавіта яны выдзяляць сродкі для рэканструкцыі помнікаў, якія па манументальнасці можна паставіць у адзін рад з гістарычнымі аб'ектамі.

— Адзін праект каштуе 7 тыс. долараў, другі — 15 тыс., — паведаміў Анатоль Нікіцін. — Гэтыя грошы паступяць з бюджэту Саюзнай дзяржавы, а мы павінны арганізаваць падрадныя работы.

З асацыяцыяй Арменіі гродзенцы таксама знайшлі агульныя кропкі. Стала вядома, што ў вёсцы Парэчча Слонімскага раёна жылі армяне, якія з'яўляліся прыхаджанамі царквы вялікамучаніка святога Георгія Пабеданосца. У сувязі з гэтым вырашана сумеснымі сіламі правесці рэканструкцыю гэтага храма.

Як генерал-маёр запасу, Анатоль Нікіцін вялікую ўвагу ўдзяляе памяці загінулых у ваенных дзеяннях. У мінулым годзе асацыяцыяй арганізавана работа па добраўпарадкаванні вайсковых могілак — было заменена амаль 80 пліт. Ёсць намер узнавіць усе могілкі, дзе пахаваны і палякі, і немцы, і яўрэі. Да гэтай работы будуць прыцягнуты партнёры замежных краін.

**Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Асацыяцыя мясцовых Саветаў створана ў адпаведнасці з законам аб мясцовым кіраванні і самакіраванні. Падобныя фарміраванні ёсць у Польшчы, Літве, Расіі і многіх іншых краінах, у Беларусі гэта першы вопыт падобнай арганізацыі. Галоўная мэта — актыўна садзейнічаць станаўленню і развіццю мясцовага самакіравання.

### Не наступаць на граблі

Акрамя міжнароднай дзейнасці, удзяляецца ўвага злабадзённым праблемам у грамадстве. Вопыт найлепшых вывучаецца і абагульняецца. Гэта дапамагае іншым не наступаць на адны і тыя ж граблі. Так, падчас выязнога семінара ў Шучыне разгледзелі пытанне па ўключэнні ў абарот будынкаў, якія пустуюць, альбо тых, якія выкарыстоўваюцца неэфектыўна.

— Такіх аб'ектаў дастаткова ў кожным раёне, — кажа Анатоль Аляксеевіч, — амаль усе яны знаходзяцца на балансе мясцовых Саветаў. Таму мы разгледзелі, як іх рамантаваць, як змяняць іх прызначэнне, на вопыце найлепшых. Наступны семінар правядзём па тэме развіцця прадпрымальніцтва: як лепш задзейнічаць тэрыторыі, якія слаба выкарыстоўваюцца?

Сабраны матэрыял ляжа ў аснову спецыяльнага дапаможніка. Органы мясцовага самакіравання змогуць карыстацца вопытам адзін аднаго. Будзе зроблены аналіз работы Саветаў — членаў асацыяцыі. Дарэчы, уступіць у новае структурнае падраздзяленне могуць усе мясцовыя Саветы па жаданні. Узносы складаюць адну базавую велічыню ў год. Сельскія Саветы наогул вызвалены ад платы за членства. Таксама ёсць дапамога спонсараў. Напрыклад, зараз на рахунку асацыяцыі 9 тыс. рублёў. Зарабляць грошы ўласнымі сіламі арганізацыя не мае права, бо з'яўляецца некамерцыйнай структурай. Таму акцэнт тут робяць на міжнародныя праекты і гранты.

Значная частка фонду ідзе на дабрачынную дзейнасць. Напрыклад, кадэцкі каледж атрымаў нядаўна камплект аргтэхнікі. Аказваецца дапамога некалькім дзіцячым установам. Першыя вынікі работы асацыяцыі мясцовых Саветаў плануецца падвесці ў канцы года.

— Мы распрацавалі дакументы на званне найлепшага сельскага Савета, камітэта тэрытарыяльнага самакіравання, старасты, — зазначае Анатоль Нікіцін. — Нам зрабілі прызы, іх 20. Будуць граматы, а таксама грашовыя прэміі, да 20 базавых велічынь за тры першыя месцы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*